Назва ТВП: Пойма Дняпра Лоеў-Жары

© С. Левый

Код: BY053

Геаграфічныя каардынаты: 51°51' N 26°36' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Гомельская вобласць: Брагінскі раён, Лоеўскі раён

Плошча: 36232 га

Крытэрыі: A1, B2, B3, A4i

Нацыянальны прыродаахоўны статус: паўночная частка Біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Днепра-Сожскі» (15212 га)

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 2010 годзе

Агульнае апісанне:

Тэрыторыя размешчаная на паўднёвым усходзе Беларусі і на ўсім працягу на мяжы з Украінай. Працягласць агульнага (памежнага) участку складае больш за 150 км. Шырыня поймы Дняпра з беларускага боку значна змяняецца – ад некалькіх сотняў метраў да некалькіх кіламетраў. На ўчастках з вузкай поймай берагі стромкія абрывістыя, вышыня берага можа складаць ад некалькіх метраў да 10-15 м.

Шырыня рэчышча складае на дадзеным участку 0,8-1,5 км, у раёне на поўнач

ад Кіеўскага вадасховішча - да 3-5 км. Рэчышча звілістае, мае шмат перакатаў і мялізн. Ніжэй в. Жылічы моцна меандрыруе, з шматлікімі пратокамі і тонямі. Падчас вясновай паводкі пойма падтапляеца на шырыню да 3-5 км. У засушлівыя гады Днепр захоўвае шырыню рэчышча ад некалькіх сотняў метраў да кіламетра і больш. Даліна ракі характарызуецца наяўнасцю старажытных тэрас (асабліва выразна вылучаныхкаля вёсакБывалькі - Дзеражычы).

Раней, відаць, пойма на значнай плошчыкасілась. Зараз косіца не значная частка. Натуральны гідралагічны рэжым практычна не парушаны. Найбольш шырока распаўсюджаны ў пойме Дняпра наступныя тыпы біятопаў: поймавыя вільготныя лугі, хмызняковыя зараснікі з адзінкавымі дрэвамі або групы дрэў, сухія рознатраўныя лугі, якія нагадваюць стэпы, рагозна-трысняговыя зараснікі, старыцы, зацягнутыя суцэльным дыванам водных раслін.

Вырашальнай умовай развіцця расліннасці і яе размеркавання па тэрыторыі поймы з'яўляецца мезарэл’еф і рэжым увільгатнення глеб, які рэзка змяняецца па ўзроўнях - ад лугова-стэпавага, на высокіх, да балотнага на нізкіх берагах. Лясная расліннасць прадстаўленая разрэджанымі, фрагментарнымі ўчасткамі. На ўзнёслых участках, некалі ўяўляўшых сабой фрагменты сухіх пяшчаных выдмх з беднай разрэджанай ксерафітнай расліннасцю сёння ўасноўным прадстаўлены хваёвыяпасадкі. У паніжэннях распаўсюджаны алешнікі, бярэзнякі, лазнякі.

Паўночная частка ТВП - заказнік "Днепра-Сожскі". Міжрэчча рэк Сож і Днепр - гэта адна з унікальных экасістэм Беларусі. Тэрыторыя ахоплівае шырокія поймы рэк Сож і Днепр, уключае поплавы, поймавыя дубровы, старыцы і азёры, па берагах зарослыя хмызняком. Узнёслыя ўчасткі заняты хваёвымі лясамі. Увогуле ў заказніку землі занятыя лясамі складаюць 48%, лугамі - 30%, хмызняковымі зараснікамі - 20%. Усяго на тэрыторыі заказніка адзначана 656 відаў вышэйшых раслін. У тым ліку 3 віда дзеразы, 6 – хвашчоў, 7 – папарацей, 1 – голанасенных, 639 – пакрытанасенных.

Асноўныя біятопы:

Тэрыторыя размешчаная на паўднёвым усходзе Беларусі і на ўсім працягу на мяжы з Украінай. Працягласць агульнага (памежнага) участку складае больш за 150 км. Шырыня поймы Дняпра з беларускага боку значна змяняецца – ад некалькіх сотняў метраў да некалькіх кіламетраў. На ўчастках з вузкай поймай берагі стромкія абрывістыя, вышыня берага можа складаць ад некалькіх метраў да 10-15 м.

Шырыня рэчышча складае на дадзеным участку 0,8-1,5 км, у раёне на поўнач ад Кіеўскага вадасховішча - да 3-5 км. Рэчышча звілістае, мае шмат перакатаў і мялізн. Ніжэй в. Жылічы моцна меандрыруе, з шматлікімі пратокамі і тонямі. Падчас вясновай паводкі пойма падтапляеца на шырыню да 3-5 км. У засушлівыя гады Днепр захоўвае шырыню рэчышча ад некалькіх сотняў метраў да кіламетра і больш. Даліна ракі характарызуецца наяўнасцю старажытных тэрас (асабліва выразна вылучаныхкаля вёсакБывалькі - Дзеражычы).

Раней, відаць, пойма на значнай плошчыкасілась. Зараз косіца не значная частка. Натуральны гідралагічны рэжым практычна не парушаны. Найбольш шырока распаўсюджаны ў пойме Дняпра наступныя тыпы біятопаў: поймавыя вільготныя лугі, хмызняковыя зараснікі з адзінкавымі дрэвамі або групы дрэў, сухія рознатраўныя лугі, якія нагадваюць стэпы, рагозна-трысняговыя зараснікі, старыцы, зацягнутыя суцэльным дыванам водных раслін.

Вырашальнай умовай развіцця расліннасці і яе размеркавання па тэрыторыі поймы з'яўляецца мезарэл’еф і рэжым увільгатнення глеб, які рэзка змяняецца па ўзроўнях - ад лугова-стэпавага, на высокіх, да балотнага на нізкіх берагах. Лясная расліннасць прадстаўленая разрэджанымі, фрагментарнымі ўчасткамі. На ўзнёслых участках, некалі ўяўляўшых сабой фрагменты сухіх пяшчаных выдмх з беднай разрэджанай ксерафітнай расліннасцю сёння ўасноўным прадстаўлены хваёвыяпасадкі. У паніжэннях распаўсюджаны алешнікі, бярэзнякі, лазнякі.

Паўночная частка ТВП - заказнік "Днепра-Сожскі". Міжрэчча рэк Сож і Днепр - гэта адна з унікальных экасістэм Беларусі. Тэрыторыя ахоплівае шырокія поймы рэк Сож і Днепр, уключае поплавы, поймавыя дубровы, старыцы і азёры, па берагах зарослыя хмызняком. Узнёслыя ўчасткі заняты хваёвымі лясамі. Увогуле ў заказніку землі занятыя лясамі складаюць 48%, лугамі - 30%, хмызняковымі зараснікамі - 20%. Усяго на тэрыторыі заказніка адзначана 656 відаў вышэйшых раслін. У тым ліку 3 віда дзеразы, 6 – хвашчоў, 7 – папарацей, 1 – голанасенных, 639 – пакрытанасенных.

Птушкі:

У вогуле пад час даследванняў на гэтай тэрыторыі адзначана каля 200 відаў птушак, з якіх гняздуюць альбо верагодна гняздуюць 139 відаў. Іншыя адзначаюцца пад час міграцыі. Найбольшае значэнне гэтая тэрыторыя мае для такіх відаў як дубальт *Gallinagomedia*, драч *Crexcrex,* малая крычка *Sterna albifrons*, белакрылая крычка *Chlidonias leucopterus*, звычайны пагоніч *Porzanaporzana*, ластаўка-зямлянка *Riparia riparia* і інш. Арнітафаўна тэрыторыі слаба вывучана і таму патрабуе далейшых даследванняў.

Іншыя групы жывел:

Іншыя группы жывел таксама даследаваны не дастаткова. З млекакормячых адзначана 36 відаў.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2003-2010)	Крытерый ТВП
Гусь-піскулька *Anser erythropus*	мг	+	2006-2010	П		
Гусь шэрая *Anser anser*	мг	+	2006-2010	П		
Качка-шылахвостка *Anas acuta*	мг	+	2006-2010	П		
Качка-чырка *Anas querquedula*	гн	250-300 п	2003-2004	Э		В2
Савук-луток *Mergus albellus*	мг	+	2006-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2003-2010)	Крытерый ТВП
Чапля-бугай *Botaurus stellaris*	гн	10-15 с	2006-2010	Э		
Чапля-лазянік *Ixobrychus minutus*	гн	5-10 п	2003-2004	Э		
Чапля-кваква *Nycticorax nycticorax*	гн?	+	2003-2004	П		
Чапля вялікая белая *Casmerodius albus*	гн	+	2006-2010	П	↑	
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	+	2006-2010	П		
Каршун чорны *Milvus migrans*	гн	1-5 п	2006-2010	Э		
Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla*	гн	3-5 п	2003-2004	Э		
Арол-вужаед *Circaetus gallicus*	мг	+	2006-2010	П		
Лунь палявы *Circus cyaneus*	гн	+	2006-2010	П		
Скапа *Pandion haliaetus*	мг	+	2006-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2003-2010)	Крытерый ТВП
Сокал-пустальга *Falco tinnunculus*	гн	+	2006-2010	П		
Сокал-кабец *Falco subbuteo*	гн	+	2006-2010	П		
Пагоніч звычайны *Porzana porzana*	гн	250-300 с	2003-2004	Э		В3
Драч *Crex crex*	гн	150-300 с	2003-2004	Э		
Журавель шэры *Grus grus*	гн	> 4 п	2007	П		
Крывок *Haematopus ostralegus*	гн	~ 20 п	2006-2010	Э		
Зуёк вялікі *Charadrius hiaticula*	мг	+	2006-2010	П		
Баталён *Philomachus pugnax*	мг	+	2006-2010	П		
Дубальт *Gallinago media*	гн	20 с	2002	Э		А1
Грыцук вялікі *Limosa limosa*	гн	+	2006-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2003-2010)	Крытерый ТВП
Кулён сярэдні *Numenius phaeopus*	мг	+	2006	П		
Кулён вялікі *Numenius arquata*	мг	+	2006-2010	П		
Кулік-селянец *Tringa nebularia*	мг	+	2006-2010	П		
Кулік-паручайнік *Tringa stagnatilis*	мг	+	2006-2010	П		
Кулік-марадунка *Xenus cinereus*	гн	5-10 п	2006-2010	Э		
Чайка малая *Hydrocoloeus minutus*	мг	+	2006-2010	П		
Чайка шызая *Larus canus*	мг	+	2006-2010	П		
Крычка малая *Sternula albifrons*	гн	30-50 п	2003-2004	Э		B2
Рыбачка белашчокая *Chlidonias hybrida*	гн	+	2006-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2003-2010)	Крытерый ТВП
Рыбачка чорная *Chlidonias niger*	гн	150 п	2003-2004	Э		B2
Рыбачка чорная *Chlidonias niger*	мг	1000-1500 ас	2003-2004	Э		
Рыбачка белакрылая *Chlidonias leucopterus*	мг	3000-5000 ас	2003-2004	Э		A4i
Пугач *Bubo bubo*	гн	2 п	2006-2010	П		
Звычайны зімародак *Alcedo atthis*	гн	+	2006-2010	П		
Дзяцел беласпінны *Dendrocopos leucotos*	гн	+	2006-2010	П		
Жаўрук-смяцюх *Galerida cristata*	гн	+	2006-2010	П		
Ластаўка-зямлянка *Riparia riparia*	гн	20000-30000 п	2003-2004	Э		B3

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2003-2010)	Крытерый ТВП
Валасяніца-белашыйка *Ficedula albicollis*	гн	+	2003-2004	П		
Сініца белая *Cyanistes cyanus*	гн?	+	2003-2004	П		
Грычун чарналобы *Lanius minor*	гн	+	2003-2004	П		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Звяры: арэшнікавая соня *Muscardinusavellanarius*.

Рэптыліі: болотная чарапаха*Emisorbicularis.*

Расліны: званок лілеялісты*Adenophoralilifolia*, цыбуля скарада *Allium scorodoprasum*, кураслеп лясны *Anemonesylvestris*, асака ценявая *Carexumbrosa*, павойнік прамы*Clematisrecta*, гваздзік армерыяпадобны *Dianthusarmeria*, лілея кучаравая*Liliummartagon*, касач сібірскі *Irissibirica*, наяда вялікая *Najasmajor*, гарлачык белы *Nymphaeaalba*, шалфей лугавы *Salviapratensis*, вадзяны арэх плывучы *Trapanatans*, фіялка багнавая*Violauliginosa*, граздоўнік многараздзельны *Botrychiummultifidum*, падвей стройны Eriophorumgracile.

Пагрозы:

Вясновае выпальванне расліннасці ў пойме, асабліва ў гады, калі адсутнічаюць павадкі, аказвае крайне негатыўны ўплыў на жывёл і расліны.

Перавыпас жывёлы. На многіх частках поймы адбываецца парушэнне структуры натуральных раслінных супольнасцей. Гэта выражаецца ў змяненні складу расліннасці лугоў. Найбольшую шкоду наносіць кашарная жывёлагадоўля. Яна не толькі цалкам знішчае раслінны пакроў, але і з'яўляецца моцнай крыніцай

забруджвання вод і глебы нітратамі.

У сувязі з істотным скарачэннем сенакосных плошчаў у пойме назіраецца хуткае зарастанне балот і адкрытых лугоў лазняком.

Лесааднаўленне на сухіх пясчаныж дзюнах вядзе да знішчэння рэдкіх экасістэм і месцаў пражывання відаў.

Рэкамендацыі па захаванню:

Для захавання тэрыторыі варта стварыць рэспубліканскі ландшафтны заказнік на ўсёй плошчы ТВП. Але ў першую чаргу неабходна дадатковыя даследванні арнітафаўны і іншых груп жывёл і раслін, а таксама даследванні накіраваныя на выяўленне негатыўных фактараў адмоўна уплываючых на экасістэмы тэрыторыі.

Неабходна таксама забарона кашарнага ўтрымання жывёл, абмежаванні па залясенню пясчаных выдм, і забарона веснавога палявання на вадаплаваючых птушак.

Крыніцы інфармацыі:

Абрамчук А.В. Абрамчук С.В. Наблюдения за редкими видами птиц на пограничном Днепре. // Беркут т. 13, вып. 1, 2003 г. – С. 128-132.

Кусенков А.Н., Горошко З.А., ШелякинИ.А. Редкие и охраняемые виды птиц Днепро-Сожского заказника // Прыроднае асяроддзе Палесся: асаблівасці і перспектывы развіцця. -Брэст, 2008.-С.158

Кусенков А.Н., Лепешко О.В., Торманова О.А. Весенний пролет представителей отряда Anseriformes в междуречье Днепра и Сожа 2008 года // Биологическое разнообразие Белорусского Поозерья: современное состояние, проблемы использования и охраны. -Витебск, 2008.-С.149-150

Svazas S., Monqin E., Grishanov G., Kuresoo A., Meissner W. O.M.P.O. Migratory Birds of the Western Palearctic. Snipes of the eastern Baltic region and Belarus. – Vilnus, 2002. – S.15-35.

Складальнікі : Абрамчук А.В., Гарошка З.А.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая*

спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org